Весці БДПУ. Серыя 1. 2022. № 4. С. 136–140.

УДК 821.161.09

# САЦЫЯЛЬНЫ МІФ У БЕЛАРУСКІМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ 90-х гг. XX ст. – 20-х. гг. XXI ст.

**Г. М. Кісліцына,**
*доктар філалагічных навук, загадчык аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Цэнтра даследаванняў культуры, мовы і літаратуры НАНБ*

Паступіў у друк 30.09.22.

UDC 821.161.09

# SOCIAL MYTH IN THE BELARUSIAN LITERATURE STUDIES OF 90s OF THE 20th CENTURY – 20s OF THE 21st CENTURY

**G. Kislitsyna,**
*Doctor of Philology, Head of the Department of Theory and History of Literature, Center for Research of Culture, Language and Literature, National Academy of Sciences of Belarus*

Received on 30.09.22.

У артыкуле асэнсоўваюцца здабыткі міфакрытычнай школы беларускага літаратуразнаўства 90-х гг. XX ст. – 20-х гг. XXI ст. Адзначаецца, што зварот да міфа мае выключнае значэнне на сучасным этапе. Аўтар разглядае працы, прысвечаныя сацыяльнаму міфу. Аб'ектам даследавання сталі манаграфіі Т. Шамякінай, С. Даніленкі, М. Іаскевіч.

*Ключавыя словы:* сацыяльны міф, міфалогія, метад, структура, тэкст, беларуская літаратура, літаратуразнаўства.

The article reveals the findings of myth-critical school of Belarusian literature studies of 90s of the 20th century – 20s of the 21st century. It notes that appealing to myth has an exclusive meaning on the modern stage. The author considers the works devoted to social myth. The object of the research is presented by the monographs by T. Shamyakina, S. Danilenka, M. Iaskevich.

*Keywords:* social myth, mythology, method, structure, text, Belarusian literature, literature studies.

Зварот да *міфалагічнага аспекту* асэнсавання нацыянальнага ў літаратуры ўяўляецца важным у тым ліку і праз тое, што сёння грамадства вымушана сутыкацца з такім выклікам сучаснасці, як інфармацыйныя войны, якія патэнцыйна вядуць да размывання культурных каштоўнасцей і крызісу нацыянальнай ідэнтычнасці. Зразумела, што паспяхова супрацьстаяць такім выклікам магчыма толькі праз кансалідацыю, праз пошук ідэй, якія аб'ядноўваюць нацыю. Відавочна, што ва ўсіх грамадскіх з'явах значную ролю адыгрывае сацыяльная міфалогія. Некаторыя міфы нараджаюцца на нашых вачах, аднак мы не часта бачым канкрэтны аналіз новых міфаў, сур'ёзныя даследаванні крыніц іх узнікнення, ацэнку магчымасцей ўплыву сацыяльнага міфа на грамадскія працэсы. Гэта звязана з тым, што *тэорыя сучаснай ці хаця б блізкай нам па часе сацыяльнай міфалогіі,* у адрозненне ад тэорыі класічных міфаў, знаходзіцца на стадыі фарміравання; адпаведна, няма і цэласнага падыходу да вывучэння сацыяльных міфаў, няма гатовых схем тлумачэння грамадскіх працэсаў у рамках паняцыяў сацыяльнай міфалогіі. Таму так важна распрацоўваць *метадалогію даследавання сацыяльнага міфа.*

Міфалагічная школа ў літаратуразнаўстве – адна са старэйшых у гісторыі навукі пра літаратуру. Яна ўзнікла ў эпоху рамантызму, дзякуючы даследаванням нямецкіх даследчыкаў Ф. Шэлінга, братоў А. і Ф. Шлегелей, Я. Грыма. а таксама англічаніна М. Мілера. Першапачаткова міфалогія разглядалася навукоўцамі як першакрыніца нацыянальнай культуры і выкарыстоўвалася як універсальнае тлумачэнне фальклорных твораў. У пачатку XX ст. адбылося станаўленне міфакрытычнай школы, штуршком для развіцця якой сталі працы Дж. Фрэзера. Міфакрытыкі займаліся даследаваннем генезісу і тыпалагічных аспектаў літаратуры, прыроды агульначалавечых «вечных» вобразаў, сімвалаў, тэм, канфліктаў, у выяўленні мастацкіх інварыянтаў ў літаратурах розных эпох. Сёння міфакрытыка як напрамак літаратуразнаўства прэтэндуе на большае, а менавіта – спрабуе разглядаць усю літаратуру, у тым ліку і найноўшую, як міф. Пры гэтым даследчыкі, у тым ліку беларускія,

прасочваюць міфалагічную аснову на самых розных узроўнях: змястоўным, структурным, і, зразумела, генетычным, так як асобныя з іх трымаюцца думкі, што міфалагічная свядомасць не страціла свайго значэння да гэтага часу. У XXI ст. асэнсаваннем міфалагізму ў літаратуры займаюцца такія беларускія даследчыкі як А. Васілевіч, А. Вальчук, Г. Друк, Л. Леська, В. Максімовіч, З. Тычына, М. Шода, А. Шылец і інш.

Доўгі час практычна адзінай тэарэтычнай працай, прысвечанай цалкам даследаванню міфалагічных сюжэтаў і вобразаў у літаратуры XVI–XX стст., была кніга В. А. Каваленкі «Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» (1981). Яна і сёння не страціла актуальнасці, таму што ў яе аснову быў пакладзены *прынцып гістарызму,* які, на думку даследчыка, ад пачатку мае сваім вектарам сучаснасць: «Прынцып гістарызму проста немагчыма ажыццявіць, калі сувязь сучаснага з мінулым будзе толькі дэклараваца і не даследавацца ў сваім рэальным эстэтычным значэнні. <…> Адносіны да мінулага – важнейшы момант ідэалагічнага жыцця савецкай краіны на працягу ўсёй яе гісторыі. Прынцып гістарычнага мыслення патрабуе лічыць мінулае традыцыйнай формай сучаснасці. Крытэрый сучаснай ацэнкі натуральна ўключае ў сябе гісторыю, зразумелую як працэс ачалавечвання ў развіцці грамадскай практыкі» [1, с. 6–7].

Кніга В. А. Каваленкі складалася з трох частак, дзе разглядаліся ўзаемадзеянне сацыяльнага міфа і літаратуры, сувязь беларускай дакастрычніцкай літаратуры з міфалагічнай і фальклорнай спадчынай і міфа-паэтычныя матывы ў беларускай савецкай літаратуры. У XXI стст. і заўвага даследчыка пра тое, што «міфалагічныя, прытчавыя і казачныя формы мастацкага адлюстравання могуць быць звязаны з плённым вырашэннем вельмі сучасных мэт і задач літаратурнай творчасці» [1, с. 318], зноў аказалася своечасовай, бо на дадзеным этапе беларуская навука пра літаратуру спрабуе разгледаць праз прызму міфа творчыя здабыткі сучаснікаў.

Працягам даследавання В. А. Каваленкі ў новым стагоддзі стала манаграфія Т. І. Шамякінай «Беларуская класічная літаратура і міфалогія» (2001). У 2008 г. выходзіць яе ж кніга «Міфалогія і беларуская літаратура» [2]. Праўда, уласна старонак прысвечаных беларускай літаратуры і яе міфапаэтычным вытокам у гэтым выданні не так багата. Найбольш цікавымі, на наш погляд, з'яўляюцца главы, прысвечаныя сакралізацыі вобраза Бацькаўшчыны ў творчасці Янкі Купалы і сакральнага ў паэзіі Якуба Коласа. Аднак асобныя каментарыі да твораў класікаў падаюцца спрэчнымі і далёкімі ад літаратуразнаўства. Так, напрыклад, пры разглядзе вершаў «Матчына прачытанне» і «Няшчасная маці» Якуба Коласа сустракаем каментарый: «Апісаныя Якубам Коласам з'явы сёння знаходзяць тлумачэнне ў навуцы, якая гаворыць пра астральныя і ментальныя целы чалавека, пра інфармацыйна-энергетычнае поле вакол кожнага матэрыяльнага аб'екта. У інтэгральных палях чалавека адлюстравана арганізацыя яго матэрыяльна-рэчыўнага цела і яго нервова-псіхічная дзейнасць. Хіба не пра тое ж – толькі іншымі словамі – роздумы Лабановіча каля карчмы?» [2, с. 347].

Каваленкаўскую традыцыю асэнсавання твораў нацыянальнай літаратуры праз выяўленне заканамернасці сацыяльнай міфатворчасці працягваюць і манаграфіі С. І. Даніленкі «Міф і Радзіма: Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму» (1999) і «Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці» (2005). Даследуючы сакралізацыю міфа Радзімы, Даніленка абапіраецца на гістарыяграфічныя працы беларускіх навукоўцаў Г. В. Кісялёва, В. А. Чамярыцкага, а ў метадалагічным плане – на даследаванне Б. А. Успенскага і У. М. Жывава «Семиотические аспекты сакрализации монарха в России» (1994). Таксама аўтар часта звяртаецца да главы «Міф і літаратура» з кнігі В. А. Каваленкі «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры».

Галоўнай мэтай свайго даследавання «Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму» С. І. Даніленка ставіць асэнсаванне з'яў літаратурнага працэсу Беларусі першай паловы XIX ст. у кантэксце рытуальнай практыкі і міфалагічнага дыскурса індаеўрапейскай архаікі і хрысціянскай кніжнасці. Ён аналізуе формы трансфармацыі асноўных касмалагічных, міфалагічных і рытуальных канцэпцый, якія вызначаюць характар беларускага этнічнага Космасу, а таксама змест гэтага працэсу, адначасова вырашаючы шэраг больш прыватных праблем.

Адной з іх стала рэканструкцыя мастацкай мадэлі свету ў творах Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча і апісанне

яе праз рытуальную апазіцыю «сакральнае-прафаннае» як найбольш агульную для любой архаічнай традыцыі: «Апазіцыя “сакральнае-прафаннае” – гэта перш за ўсе апазіцыя “Космас-Хаос”, дзе Космас утвараецца з Хаосу пры здзяйсненні першакасмагоніі, першарытуалу і адрозніваецца наяўнасцю Закону як асноўнага прынцыпу яго арганізацыі. Энтрапічная прырода Хаосу выклікае неабходнасць паўтарэння касмагоніі, дзе яна становіцца сакральным прэцэдэнтам, узорнай мадэллю для перыядычнага паўтарэння. Праз гэта сама ідэя дзяржавы-Радзімы як універсальная форма этнічнай самаарганізацыі і самаўпарадкавання з непазбежнымі узлётамі, падзеннямі і новымі ўзлётамі самым непасрэдным чынам звязана са сферай сакральнага, дзе касмаганічны рытуал дадзенай культурнай і міфалагічнай традыцыі заўсёды ёсць інварыянт шэрагу этнаганічных рытуалаў гэтай традыцыі» [3, с. 81].

Гэтая гіпотэза прывяла С. І. Даніленку да ідэі неабходнасці вычлянення з тканіны даследуемых мастацкіх тэкстаў фармальнай схемы рытуалу наогул і касмагоніі-ініцыяцыі ў прыватнасці. Найбольшая ўвага даследчыка звернута на тое, як у аналізуемых ім творах адлюстроўваюцца крызісныя моманты існавання дзяржавы – этнічныя крызісы: заснаванне сталіцы і набыццё рэлігіі; пакаранне за грахі са стратай дзяржаўнасці ў выніку гэтага пакарання; адраджэнне страчанай дзяржаўнасці. Даследчык вылучае тры фазы міфалагізаванай этнічнай гісторыі, якія адпавядаюць фармальнай схеме ініцыяцыі. *Нараджэнне і сталенне* («Радзівіл, альбо Заснаванне Вільні» Я. Чачота, «Стаўроўскія дзяды» В. Дуніна-Марцінкевіча), *смерць* («Падземны звон на горцы ў Пазяневічах», «Свіцязь», «Наваградскі замак» Я. Чачота, «Люцынка, альбо Шведы на Літве» В. Дуніна-Марцінкевіча), *адраджэнне* («Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага) [3, с. 81].

Акрамя таго, на думку С. І. Даніленкі, «кожны са згаданых этнічных крызісаў, які мае стваральны імпульс (заснаванне сталіцы і набыццё рэлігіі, постэсхаталагічнае адраджэнне дзяржаўнасці), мае выразную трохчленную падструктуру, якая ўключае ў сябе: а) выяўленне старога сакральнага цэнтра свету, як найбольш касмалагізаванай кропкі прасторы, функцыяй якога з'яўляецца трансляцыя ў прасторы і часе гістарычнай памяці, скіраванай на захаванне пераемнасці сакральнай гісторыі этнасу; б) заснаванне новага сакральнага цэнтра свету, мэтай якога з'яўляецца набыццё / аднаўленне новых/старых патэнцый развіцця грамадства, якія застаюцца нязменнымі на ўсім працягу сакральнай этнічнай гісторыі: прыярытэт духоўнага над матэрыяльным, класавы салідарызм, аўтарытэт продкаў; в) засваенне соцыумам новага сакральнага цэнтра свету з мэтай найбольшай актуалізацыі здабытых патэнцый і пашырэння іх уплыву на ўсё грамадства» [3, с. 82].

Кожны з гэтых *этапаў*, на думку даследчыка, мае сваю трохчленную падструктуру, якая, у сваю чаргу, з'яўляецца структурай ініцыяцыі: «а) герой-ініцыянт выходзіць за межы соцыуму; б) герой-ініцыянт сімвалічна ці “рэальна” памірае праз ахвярапрынашэнне ці самаахвяраванне; в) герой-ініцыянт адраджаецца да новага жыцця ў новым сакральным статусе» [3, с. 82].

Абраны для даследавання *метад структурнага аналізу* дазваляе С. І. Даніленку даказаць, што «ў творчасці Я. Чачота, Я. Баршчэўскага і В. Дуніна-Марцінкевіча міфалагізаваная этнічная гісторыя прадстае як трохузроўневая сістэма са складанай іерархіяй, дзе кожнаму элементу вышэйшай трохчленнай структуры адпавядаюць тры элементы яе падструктуры» [3, с. 82]. Пры гэтым ён робіць важную для разумення тэмы заўвагу пра тое, што «ў рэальных мастацкіх тэкстах некаторыя элементы гэтай сістэмы могуць толькі кантэкстуальна абумоўлівацца, альбо могуць накладвацца адзін на адзін, аднак гэта не змяняе самой сутнасці сістэмы, якая пабудавана па агульных законах рытуалу, і якая яго логікай дэтэрмінуецца» [3, с. 82].

Манаграфія С. І. Даніленкі «Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці» працягвае даследаванні, распачатыя ў кнізе «Міф і Радзіма: Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму». Даследчык застаецца верным абранай метадалогіі, але змяняе ракурс погляду і пашырае матэрыял. Узяўшы за мэту выяўленне таго, як у беларускай савецкай і постсавецкай літаратуры адлюстроўваецца сацыяльны міф камунізму, аўтар звяртаецца да паняццяў Дабра і Зла. Сыходзячы з меркавання, што сацыяльны міф з'яўляецца прадуктам хрысціянскай цывілізацыі, а таму «сакралізуе сваіх прарокаў і дэманізуе сваіх ворагаў у звыклых метафарах боскасці і д'ябальшчыны» [4, с. 6], аўтар звяртаецца да даследавання менавіта *інфернальнай вобразнасці* нацыянальнай літаратуры. У манаграфіі разглядаюцца такія

праблемы, як сакралізацыя ўлады ў беларускай савецкай паэзіі 1920–1950 гг., дэманізацыя ворагаў СССР у паэзіі 1920–1980-х гг., эсхаталагічныя метафары, звязаныя з Чарнобыльскай аварыяй ў беларускай паэзіі 1980–1990-х гг., іранічная дэманізацыя знакавых элементаў савецкай культуры ў беларускай літаратуры 1970–1990-х гг. Заўважна, што ў першай кнізе аўтар звяртаўся да ідэй, выказаных В. А. Каваленкам у «Міфапаэтычных матывах у беларускай літаратуры» як да абсалютнай ісціны, у нечым сакралізуючы вобраз папярэдніка, то ў «Спецыфіцы сацыяльнай міфатворчасці» ён прама палемізуе з В. А. Каваленкам, прынамсі, аспрэчваючы думку пра тое, што сацыяльны міф можа быць «тормазам на шляху грамадскага працэсу», сцвярджаючы, што сацыяльны міф – абсалютна аб'ектыўная з'ява ў грамадскім жыцці і мастацкай творчасці, прыналежнай архетыпічным асаблівасцям чалавечай псіхікі, і ў гэтым плане выступае як адзнака жыццесцвярджальнага аптымізму чалавечай натуры [4, с. 6]. Метадалагічныя падыходы С. І. Даніленкі дазваляюць ускрыць механізм пранікнення сацыяльных міфаў у паўсядзённае жыццё і культуру, па-новаму паглядзець на творы, якія складаюць нацыянальны канон беларускай літаратуры XIX–XX стст.

Важнай для разумення праблем сённяшняга беларускага грамадства выглядае і манаграфія М. М. Іаскевіч «Социальный миф и повседневность в белорусской прозе советского периода» (2020). Аўтар на матэрыяле твораў Я. Коласа, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, Р. Мурашкі, З. Бядулі, А. Кулакоўскага, І. Мележа, У. Карпава, І. Шамякіна, Л. Гаўрылкіна, В. Гігевіча даследуе абумоўленасць штодзённасці сацыяльнымі міфамі. Даследчыца лічыць, што мастацкі твор можа выступаць адным са сродкаў укаранення сацыяльнага міфа, аказваць уздзеянне на чытацкую свядомасць. У манаграфіі яна ставіць сабе задачу раскрыць аўтарскія механізмы, якія абумоўліваюць гэта ўкараненне праз мастацкі малюнак, выяўляючы элементы штодзённасці на розных узроўнях тэксту. М. М. Іаскевіч спрабуе пабудаваць тэарэтычную мадэль узаемадзеяння сацыяльнага міфа і штодзённасці на розных узроўнях паэтыкі мастацкіх твораў, а менавіта на сюжэтна-кампазіцыйным узроўні, узроўні сістэмы персанажаў, узроўні акта гаварэння, а таксама на ўзроўні гістарычнага кантэксту.

Механізм пранікнення міфа ў паўсядзённасць бачыцца ёй наступным чынам: «Сацыяльны міф пранікае ў мастацкі твор перш за ўсё праз тэму, абумоўленую сацыяльнай замовай, якая тлумачыць гістарычную падзею альбо ідэалагічную канцэпцыю з пэўнага пункту гледжання. Да празаічных сацыяльна-міфалагічных твораў савецкай эпохі адносяцца *кнігі рэвалюцыйнай тэматыкі, творы пра калектывізацыю, а таксама раманы вытворчай тэматыкі*. Яны валодаюць агульнай кампазіцыйнай будовай і выяўляюць аднолькавыя механізмы ўздзеяння сацыяльнага міфа на чытацкае ўспрыманне праз складнікі паўсядзённасці» [5, с. 15].

Сярод міфаў савецкай сацыяльнай міфалогіі М. М. Іаскевіч вылучае тыя, што найчасцей даследаваліся навукоўцамі. Гэта «міф пра стварэнне свету», «міф аб залатым часе», «міф пра героя-месію», «міф пра “ворагаў”», «міф пра стварэнне новага чалавека». Абапіраючыся на меркаванні К. Леві-Строса і У. Я. Пропа пра тое, што ўсе міфы адрозніваюцца толькі зместам, але адзіныя ў сваёй структуры, даследчыца вылучае наступныя архаіка-міфалагічныя функцыі героя: 1) герой трапляе ў «мёртвы свет»; 2) герой адчувае недахоп (тэрмін Пропа); 3) дзеянні героя; 4) герой «перажывае» (у арыгінале «претерпевает»); 5) адраджэнне героя. Распазнаванне гэтых функцый у тэксце дазваляе даследчыцы суадносіць тэксты беларускай літаратуры з іх міфічнымі прататыпамі. Найбольш прыдатнымі метадамі для выяўлення ўзаемадзеяння сацыяльнага міфа і паўсядзённасці ў мастацкіх творах М. Іаскевіч лічыць культурна-гістарычны, сацыялагічны і міфапаэтычны з элементамі нараталагічнага аналізу [5, с. 16].

Нягледзячы на абяцанне прадэманстраваць метадалогію даследавання ўзаемадзеяння сацыяльнага міфа і паўсядзённасці, М. М. Іаскевіч не апісвае ўласна нейкую методыку, якая б магла быць прынятая і іншымі даследчыкамі. Узнікае ўражанне, што даследчыца ідзе проста шляхам супастаўлення, знаходзячы міфы там, дзе іх, магчыма, ніколі не было. Выказанае ёю меркаванне, што «дзяцінства героя-пастуха асацыюецца з вобразам Ісуса як “добрага пастыра”, які навучае на добры шлях метафарычны “статак”, асабліва “аблудных авечак”» [5, с. 94], становіцца нагодай для таго, каб бачыць у палове герояў беларускай прозы Ісуса Хрыста. Прынамсі, бачыць даследчыца яго ў тых персанажах, у каго па сюжэце няма бацькі: «Больш таго, той факт, што ў героя няма бацькі, з'яўляецца біблійнай алюзіяй на бязгрэшнае зачацце, боскую місію. Герой прыпадабняецца да Хрыста,

месіі, закліканага выратаваць чалавецтва. Такім чынам, у рэвалюцыйных творах падабенства сюжэта ў малюнку дзяцінства героя валодае адзіным міфалагічным біблейскім падтэкстам богаабранасці» [5, с. 94]. У якасці прыкладу згадваецца Ігнат, герой рамана Р. Мурашкі «Сын», і Рыгор, герой рамана «Сокі цаліны» Ц. Гратнага. Пры гэтым літаратуразнаўца выпускае з увагі той факт, што Рыгор – герой адмоўны, які кідае сваю маці на волю лёсу, удае сваю дзяўчыну і г. д. Героем-«прапаведнікам», які нясе «новую веру», бачыцца М. М. Іаскевіч і Мацей Мышка з «Віленскіх камунараў» М. Гарэцкага.

Не стаў выключэннем і Лабановіч, у кожным учынку якога М. М. Іаскевіч бачыць алюзія на жыццяпіс Ісуса Хрыста, і, у прыватнасці, на яго пакутніцкую смерць. Напрыклад, калі яна піша, што першыя дзве кнігі трылогіі «На росстанях» заканчваюцца сімвалічнай смерцю героя, прыводзячы ў якасці аргумента досыць спрэчны эпізод развітання з каханай: «Я памёр ужо, – трагічна прамовіў Лабановіч. – Дык гэта ж хаваць тут будуць? – жартавала яна. – Можа, пабегчы пасклікаць баб, каб паплакалі па вас?» [5, с. 116]. Сімвалічнай смерцю бачыцца даследчыцы і момант, калі герой Я. Коласа трапляе ў турму: «Лабановіч, падобна Хрысту, бярэ на сябе віну – "грахі" сваіх сяброў і сам пакутуе» [5, с. 116]. Эпізод выдачы Лабановіча і Тукалы сялянамі таксама прачытваецца як біблійны сюжэт: «Тут таксама відавочная біблійная алюзія, бо менавіта натоўп народа вырак Хрыста, які прыйшоў выратаваць чалавецтва ад граху, на распяцце» [5, с. 111].

Трэба пагадзіцца, што суаднясенне біблійных сюжэтаў з кожным згаданым у працы М. М. Іаскевіч «Социальный миф и повседневность в белорусской прозе советского периода» эпізодам не выклікае пярэчанняў, але згаданыя раманы класікаў – кампазіцыйна цэласныя творы, а не зборнік казак ці навел. Дэканструіруючы тэкст, вычляняючы асобныя эпізоды, якія адпавядаюць схеме функцый героя, даследчыца ігнаруе агульную карціну мастацкай рэчаіснасці, якую выбудоўвалі пісьменнікі. Тым больш гэта крыўдна таму, што асобныя з гэтых твораў маюць пад сабой аўтабіяграфічную аснову.

На жаль, варта канстатаваць, што сёння для даследчыкаў, якія працуюць з міфамі і іх увасабленнем у творах беларускай літаратуры, раскладанне тэксту на дробныя структуры без уліку агульнай ідэйна-мастацкай скіраванасці твора і яго мастацкай цэласнасці – даволі распаўсюджаная практыка, якую было б добра пераадолець. Разам з тым, відавочна, што даследаванні сацыяльных міфаў сёння – адзін з самых цікавых і дыскусійных напрамкаў айчыннага літаратуразнаўства. Гэтыя працы не простыя для ўспрымання, бо іх аўтары спрабуюць структурыраваць вялікі аб'ём даследуемага матэрыялу. Асобна варта адзначыць, што ў працах сённяшніх літаратуразнаўцаў (Т. І. Шамякіна, С. І. Даніленка) назіраецца пераемнасць з даследаваннямі папярэднікаў, напрыклад, з манаграфіяй В. А. Каваленкі «Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры».

### *Літаратура*


1. *Каваленка, В. А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 318 с.
2. *Шамякіна, Т. І.* Міфалогія і беларуская літаратура : нарысы і эсэ [для ст. шк. узросту] / Т. І. Шамякіна ; пасляслоў. І. Чароты. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 389 с.
3. *Даніленка, С.* Міф і Радзіма: Сакралізацыя дзяржавы-Радзімы ў літаратуры польска-беларускага рамантызму / С. Даніленка ; рэдкал.: А. М. Ненадавец (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Палібіг, 1999. – 113 с.
4. *Даніленка, С. І.* Спецыфіка сацыяльнай міфатворчасці ў савецкай і постсавецкай беларускай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці / С. І. Даніленка. – 2-е выд. – Магілёў : Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, 2005. – 228 с.
5. *Иоскевич, М. М.* Социальный миф и повседневность в белорусской прозе советского периода / М. М. Иоскевич. – Минск : Беларус. навука, 2021. – 300 с.


### *References*


1. *Kavalenka, V. A.* Mifa-paetychnyya matyvy u belaruskaj litaratury / V. A. Kavalenka. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1981. – 318 s.
2. *Shamyakina, T. I.* Mifalogiya i belaruskaya litaratura : narysy i ese [dlya st. shk. uzrostu] / T. I. Shamyakina ; paslyasl. I. Charoty. – Minsk : Mast. lit., 2008. – 389 s.
3. *Danilenka, S.* Mif i Radzima: Sakralizacyya dzyarzhavy-Radzimy u litaratury pol'ska-belaruskaga ramantyzmu / S. Danilenka ; redkal.: A. M. Nenadavec (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : Palibig, 1999. – 113 s.
4. *Danilenka, S. I.* Specyfika sacyyal'naj mifatvorchasci u saveckaj i postsaveckaj belaruskaj litaratury u kantekscе yae infernal'naj vobraznasci / S. I. Danilenka. – 2-e vyd. – Magilyou : Belaruska-Rasijski universitet, 2005. – 228 s.
5. *Ioskevich, M. M.* Social'nyj mif i povsednevnost' v belorusskoj proze sovetskogo perioda / M. M. Ioskevich. – Minsk : Belarus. navuka, 2021. – 300 s.